ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
11
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 9 (1347)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА




## НА ЧАРГОВЫМ

пасяджэнні арганізацыйна-масавай камісіі прафкома падведзены вынікі спаборніцтва арганізацыйна-масавых камісій прафбюро факультэтаў за мінулы месяц. Лепшымі прызнаны камісіі мехмата (старшыня А. Зайцава), гістфака (В. Русак), ФПМ (І. Касцюшка), журфака (У. Абрамовіч) і хімфака (В. Катлашэўская).

**В. КАНАНОВІЧ,**
старшыня арганізацыйна-масавай камісіі прафкома.

## ГАНАРОВАЙ ГОСЦЯЙ

студэнтаў другога курса гістарычнага факультэта была напярэдадні Міжнароднага жаночага Дня 8 сакавіка Герой Савецкага Саюза А. Р. Мазанік. Яна выступіла з хвалюючымі ўспамінамі пра геraічныя дні Мінскага падполля.

**Н. ПАЎСЦЮК.**

## ПАДПІСАННЕМ ДАГАВОРА

аб супрацоўніцтве паміж камітэтам камсамола БДУ і гвінейскім зямляцтвам пачаўся ва універсітэце тыдзень савецка-гвінейскай дружбы, які праводзіць камітэт камсамола мехмата. На падпісанні прысутнічалі сакратар камітэта камсамола БДУ А. М. Рухля, прэзідэнт гвінейскага зямляцтва Абдулай Сісэ, дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі Р. А. Малюковіч, савецкія і замежныя студэнты.

**А. ЗАГРАЮК,**
намеснік сакратара камітэта камсамола мехмата па інтэрработе.

## НАРОДНЫ ТЭАТР

універсітэта выступіў у гарадскім Доме настаўніка на вечары работнікаў асветы са спектаклем па п'есе А. Валодзіна «Дзве стралы». Гледачы цёпла прынялі самадзейных артыстаў.

**А. АНКУДЗІНАВА,**
студэнтка філфака.






БДУ стаў родным домам для юнакоў і дзяўчат многіх нацыянальнасцей нашай краіны.

На здымку — студэнты-чацвёртакурснікі факультэта журналістыкі: руская Алена Сальнікава, беларус Аляксандр Слабадчук і украінка Тамара Вяцкая.

Фота **В. Шачака.**

# ВЫХОЎВАЦЬ ПАЧУЦЦЁ РАДЗІМЫ

## РЭПАРТАЖ З КАНФЕРЭНЦЫІ ЧЫТАЧОЎ ПА КНІЗЕ Л. І. БРЭЖНЕВА «УСПАМІНЫ»

**У промнях сонечнага святла вялікая аўдыторыя хімічнага факультэта здавалася яшчэ большай і святлейшай. Студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі факультэта сабраліся тут сёння, каб правесці канферэнцыю па новаму твору Л. І. Брэжнева «Успаміны». Сабраліся, каб яшчэ і яшчэ раз успомніць дарагія ўсім нам старонкі, шчыра і ўсхвалявана пагаварыць пра свае думкі, пачуцці, бо «каб добра разумець і цаніць цяперашняе, чалавек павінен у сапраўдным святле бачыць мінулае».**

**Слова — старшыні секцыі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны універсітэта, кандыдату гістарычных навук І. В. Марчанку:**

— З вялікай любоўю піша Л. І. Брэжнеў пра тых, хто ствараў рэвалюцыйную гісторыю, пра саратнікаў У. І. Леніна — І. В. Бабушкіна, Р. І. Пятроўскага. На прыкладзе роднай сям'і Л. І. Брэжнеў паказвае атмасферу сапраўды чалавечых адносін, уласцівых працоўным людзям як горада, так і вёскі. Аўтар «Успамінаў» удзячны лёсу за тое, што ён даў яму ўрокі жыцця на сялянскім палетку і пад дахам завода, вызначыўшы павагу да працы заводскай і працы земляробчай. Характар Леаніда Ільіча быў загартаваны працай на заводзе, службай у арміі, вучобай на рабфаку, у інстытуце. Жыццё Л. І. Брэжнева — гэта яго асабісты лёс і адначасова гэта лёс нашай краіны. Кніга Л. І. Брэжнева, можна сказаць, перадае біяграфію Радзімы, тых людзей, хто прайшоў суровую жыццёвую школу барацьбы.

**Выступае кавалер трох ордэнаў Чырвонага Сцяга, член КПСС з 1927 года Ф. Ф. Церашонак:**

— Так, вельмі дарагія ўсім нам старонкі з кнігі, дзе Леанід Ільіч расказвае пра сваю сям'ю, бацькоў. Трэба глыбей учытацца ў гэтыя радкі тым сучасным маладым людзям, якія, не паспеўшы стварыць сям'ю, ужо пачынаюць перажываць нейкія канфлікты, людзям, якія сваім эгаізмам атручваюць жыццё сабе і іншым, забываючы пра існаванне маральных норм, абавязковых для ўсіх.

Шмат розных тэм закрануў Л. І. Брэжнеў у сваёй кнізе. Вось адна з цытат: «Зразумела, абараняючы дыплом інжынера, я не думаў, што ў будучым мне трэба будзе займацца аднаўленнем «Запарожсталі», кіраваць абароннай прамысловасцю вобласці і нават усёй краіны. Працуючы землеўпарадчыкам, не думаў, што разам з таварышамі давядзецца мне пераўладкоўваць зямлю на мільёнах цалінных гектараў, а, атрымліваючы ваенную вывучку, не ўяўляў у поўнай меры, як спатрэбіцца яна ў найцяжэйшай вайне. Не ведаў і таго, што ўсё гэта разам узятае, пры пастаянных зносінах з мноствам людзей ператворыцца ў сплаў вопыту, навыкаў, ведаў... І толькі з гадамі я стаў разумець, што мяне, як і тысячы іншых людзей, сапраўды рыхтавалі, прычым зусім свядома, да будучых вялікіх спраў».

**Гаворыць студэнтка IV курса, стыпендыятка прэміі імя Шверніка Марыя Шлык:**

— У кнізе «Успаміны» ёсць цудоўныя словы: «Пачуццё Радзімы ва ўсіх нас развіта вельмі моцна. Цудоўнае пачуццё! І яно жывіцца, вядома, не толькі сузіраннем хараства нашай зямлі. Трэба, як гаворыцца, урасці ў яе каранямі, і калі чалавек да поту папрацуе на ёй, хлеб вырасціць, закладзе горад, пабудуе новую дарогу або акопы будзе капаць на гэтай зямлі, абараняючы яе, — вось тады ён зразумее да канца, што такое Радзіма». Пачуццё Радзімы выхоўваецца ў нас з самых малых гадоў, яно жыве ў нас. Можа таму мы не заўсёды разумеем, як гэта пачуццё сказваецца на ўсіх нашых справах, вялікіх і малых. Мы з'яўляемся ўдзельнікамі студэнцкіх будатрадаў, кожны з нас імкнецца паехаць далей, зрабіць болей. І працуем да поту. Ні з чым не параўнальная радасць працоўнай перамогі, адчуванне роднасці з зямлёй, кроўнасці са справай — гэта, мабыць, і ёсць вялікае пачуццё Радзімы, адказнасць за яе.

**Слова бярэ выдатніца вучобы Валянціна Сідорка:**

— Кніга «Успаміны» — перш за ўсё кніга для моладзі. Сучасным маладым людзям ёсць чаму павучыцца ў камсамольцаў мінулых гадоў. Гераічная моладзь! Але тое, што цяпер здаецца нам рамантычным, авеяным легендарнай славай, было звычайнай будзённай работай. Праз цяжкасці, складаныя абставіны яны ўмелі бачыць дзень заўтрашні — наша з вамі сённяшняе жыццё. І мы ўдзячны іменна за тое, што ім «да ўсяго была справа». Хочацца запэўніць нашых ветэранаў, людзей старэйшага пакалення, што ўсё тое, чаму вучыць нас кніга Л. І. Брэжнева, будзе ўвасабляцца ў нашых здзяйсненнях, справах.

**Канферэнцыя закончылася. Але не адзін яшчэ раз кожны з нас будзе звяртацца да старонак «Успамінаў», знаходзячы крыніцу натхнення, сіл, вопыту.**

**А. ЛЫСЮК,**
**студэнтка II курса журфака.**

# НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ У ДЗЕЯННІ

## СТЫПЕНДЫЯ. ПАРАДАК НАЗНАЧЭННЯ

АДДЗЕЛ матэрыяльнага забеспячэння і быту правёў праверку правільнасці выканання «Інструкцыі аб парадку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам вышэйшых навучальных устаноў» на 5 факультэтах: юрыдычным, хімічным, геаграфічным, журналістыкі і ФПМ. У праверцы ўдзельнічалі прафоргі, камсоргі, намеснікі дэканаў, члены стыпендыяльных камісій факультэтаў.

Устаноўлена, што стыпендыяльныя камісіі працавалі ў саставе, зацверджаным загадам рэктара, і засядалі адразу пасля сесіі. На пасяджэнні запрашаліся куратары груп, старасты, камсоргі, прафоргі. Стыпендыі ў першую чаргу назначаны студэнтам, якія атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі. З фонду, які застаўся, назначаны стыпендыі некаторым студэнтам, якія маюць здавальняючыя адзнакі, але актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці. Звесткі аб грамадскай рабоце кожнага студэнта ёсць у матэрыялах стыпендыяльных камісій. Тут адлюстраваны ўдзел у мастацкай самадзейнасці, спорце, навуковай рабоце, а таксама заахвочванні або спагнанні, наяўнасць пропускаў заняткаў без уважлівых прычын. Пратаколы падрабязна адлюстроўваюць ход работы стыпендыяльных камісій.

Стыпендыяльны фонд факультэтам вызначаны з разліку 72,5 працэнта забеспячэння студэнтаў. Тэрміны выдачы стыпендый не парушаюцца. Не было выяўлена і грубых парушэнняў, звязаных з іх размеркаваннем. Аднак трэба адзначыць, што стыпендыяльная камісія на хімфаку ў змененым саставе зацверджана толькі распараджэннем дэканата.

На геаграфічным факультэце рашэннем стыпендыяльнай камісіі пазбаўлены стыпендыі за недысцыплінаванасць студэнт IV курса А. Алешка. Там таксама па просьбе камітэта камсамола стыпендыяльная камісія зняла павышаную на 25 працэнтаў стыпендыю з аднаго са студэнтаў IV курса. Яму назначана звычайная стыпендыя. Аднак рашэнне стыпендыяльнай камісіі не ўзгаднялася з прафсаюзнай арганізацыяй.

На хімфаку студэнтцы III курса Н. Цярэшка, якая здала сесію на выдатна і займаецца грамадскай работай, назначана стыпендыя, павышаная толькі на 15 працэнтаў замест патрэбных 25.

Камітэт народнага кантролю рэкамендуе факультэцкім ГНК планаваць і праводзіць праверкі назначэння і выплаты стыпендый на факультэтах і даныя рэгулярна прадстаўляць у КНК БДУ.

Дэканатам і стыпендыяльным камісіям прапанавана пастаянна забяспечваць шырокую галоснасць вынікаў работы стыпендыяльных камісій.

**М. КУЛЫГІНА,**
**інспектар няштатнага аддзела матэрыяльнага забеспячэння і быту.**

## Выкарыстоўваць якасна

У АПОШНІ ЧАС у навукова-даследчых інстытутах ПФП і ФХП праведзена дастаткова актыўная работа па павышэнню эфектыўнасці выкарыстання абсталявання. Разам з тым праверкай камітэта народнага кантролю выяўлены некаторыя недахопы.

У НДІ ПФП шэраг імпартных прылад на працягу доўгага часу не эксплуатуюцца з-за няспраўнасці электрамеханічных вузлоў ці па прычыне выхаду са строю камплектуючых частак. Электронны мікраскоп ужо не працуе некалькі месяцаў, чакаючы гарантыйнага рамонту. Адзначаны перабоі з дастаўкай вадкага азоту, што затрымлівае правядзенне доследаў на некаторых прыладах.

На большасць правераных прылад не заведзены журналы ўліку праведзеных на іх работ.

Камітэт народнага кантролю БДУ лічыць неабходным на ўсіх факультэтах універсітэта да 30 чэрвеня 1982 года арганізаваць рамонт няспраўнага дарагакаштуючага абсталявання і ў выпадку немагчымасці рамонту правесці спісанне прылад або іх перадачу зацікаўленым арганізацыям. Трэба скласці адпаведныя спісы з указаннем неабходных запчастак і хадайнічаць аб іх набыцці перад вышэйстаячымі арганізацыямі.

Прарэктару па навуковай рабоце універсітэта І. П. Зяцькову рэкамендавана разгледзець магчымасць стварэння агульнаўніверсітэцкай групы высокакваліфікаваных спецыялістаў па абслугоўванню і рамонту навуковага абсталявання, якое ўключае сучасныя электронныя і вопытна-механічныя вузлы.

Групам НК падраздзяленняў узяць на кантроль няўхільнае выкананне распараджэння рэктара аб неабходнасці вядзення журналаў па ўліку выкарыстання ўсіх дарагакаштуючых прылад.

**Д. МАЙБАРАДА,**
**інспектар няштатнага аддзела кантролю за навуковай работай.**

## Шляхам удасканалення

НА ФАКУЛЬТЭТАХ і ў іншых структурных падраздзяленнях універсітэта працуюць 22 групы народнага кантролю. Іх дзейнасць накіроўваецца створаным у маі 1981 года камітэтам народнага кантролю. Партыйны камітэт і партыйныя бюро нямала зрабілі для ўмацавання саставу груп народных кантралёраў. Сярод іх 95 камуністаў і 23 камсамольцы. Удзел у органах народнага кантролю разглядаецца як важнае партыйнае і грамадскае даручэнне.

Партыйныя арганізацыі факультэтаў перыядычна заслухоўваюць справаздачы ГНК на бюро, партыйных сходах, дзе даецца ацэнка дзейнасці народных кантралёраў, намячаюцца канкрэтныя меры па яе актывізацыі.

Народныя кантралёры выкарыстоўваюць розныя формы кантролю. Высокаэфектыўнымі з'яўляюцца праверкі, якія праводзяць НК сумесна з КП. За 1981 год камітэт народнага кантролю і ГНК падраздзяленняў правялі 105 праверак. У большасці выпадкаў вынікі праверак абмяркоўваліся на пасяджэннях камітэта і груп з запрашэннем асоб, якія адказныя за той ці іншы ўчастак работы. Пастановы і матэрыялы праверак перадаваліся ў рэктарат, дэканаты, партбюро для прыняцця адпаведных мер. Многія недахопы ліквідуюцца ў ходзе праверак. Народныя кантралёры не пакідаюць без увагі гаспадарчую дзейнасць, пытанні эканоміі і беражлівасці, эфектыўнасць навуковых даследаванняў і вынікі ўкаранення закончаных распрацовак у вытворчасць, быт і адпачынак студэнтаў. З кантролю пытанні здымаюцца толькі пасля ліквідацыі выяўленых недахопаў.

Партком універсітэта нацэльвае народных кантралёраў на аператыўную работу і своечасовае прыняцце мер па ліквідаванню недахопаў. Так было пры штогадовых праверках гатоўнасці універсітэта да работы ў зімовых умовах, пры арганізацыі рэйдавых праверак эканоміі электраэнергіі ў вучэбных карпусах і інтэрнатах.

З мэтай паспяховага выканання рашэнняў XXVI з'езда КПСС, заданняў XI пяцігодкі КНК лічыць неабходным здзяйсненне мерапрыемстваў, якія прыняты на сходзе актыву народнага кантролю ў маі 1981 года, у якіх вялікая ўвага ўдзяляецца пытанням кантролю за якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў, павышэння эфектыўнасці НДР, скарачэння страт працоўнага часу, эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў, паляпшэння грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання студэнтаў і супрацоўнікаў.

Патрэбна адзначыць, што шматлікія праверкі, якія праводзяць КНК і ГНК падраздзяленняў, выяўлялі выпадкі безгаспадарчасці, безадказных адносін да справы асобных служб АГЧ. Вынікі праверак даводзіліся да ведама прарэктара АГЧ У. І. Сіліна і сакратара партбюро АГЧ С. М. Касячэнкі. Трэба было чакаць, што група народнага кантролю АГЧ выступіць актыўным памочнікам КНК універсітэта ў своечасовай ліквідацыі выяўленых недахопаў. Як паказала жыццё, партбюро АГЧ не забяспечыла правільнага фарміравання сваёй ГНК, не здзяйсняецца патрэбны кантроль за работай гэтай групы, якая існуе толькі фармальна. На сваім пасяджэнні 29 студзеня 1982 года КНК заслухаў справаздачу аб рабоце ГНК АГЧ і прызнаў яе нездавальняючай.

Прайшоў год пасля прыняцця пастановы КНК БССР аб пераўтварэнні ГНК БДУ ў КНК, а ўсё яшчэ не вырашаны пытанні з выдзяленнем памяшкання для камітэта і метадычнага кабінета, забеспячэння камітэта канцылярскімі прыналежнасцямі і тэхнічнай дапамогай пры афармленні дакументаў.

Трэба таксама самакрытычна прызнаць, што КНК БДУ не поўнасцю выкарыстоўвае свае правы, якія вызначаны «Законам аб народным кантролі ў СССР», не мабілізуе рэзервы па ўзмацненню свайго ўплыву на выніковыя рэзультаты дзейнасці калектыву.

Адказныя задачы, якія паставілі перад ВНУ XXVI з'езд КПСС і XXIX з'езд КПБ, патрабуюць далейшага ўдасканалення форм і метадаў народнага кантролю, павышэння актыўнасці і ініцыятывы па ліквідацыі недахопаў. Толькі пастаянная дапамога партыйнай арганізацыі, глыбокі аналіз, шырокая галоснасць, прынцыповасць у ацэнцы становішча спраў на месцах узнімуць аўтарытэт народнага кантролю універсітэта.

**А. КАСПЯРОВІЧ,**
**старшыня камітэта народнага кантролю універсітэта.**

## ЗАЎСЁДЫ НА ПАСТУ

**● АКТЫВІСТЫ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ**

СОРАК СЁМЫ аўтобус чамусьці не падыходзіць да прыпынку вельмі доўга. Чакаем. Але для мяне незаняты час — падарунак. Патроху пераводжу гаворку на ўспаміны. Ведаю — пасля проста не будзе магчымасці задаваць пытанні.

Пакуль дабраліся да Шчамысліцы, высветлілася, што Мікалай Філімонавіч Кавалёў заняўся пытаннямі народнага кантролю амаль з самага пачатку службы ў радах Савецкай Арміі. А з 1972 года ён працуе ў Белдзяржуніверсітэце. Старшыня ГНК кафедры, член галаўной групы народнага кантролю універсітэта, а потым, з ператварэннем яе ў камітэт народнага кантролю—кіраўнік няштатнага аддзела матэрыяльнага забеспячэння і быту. Заўважым, што ўвесь гэты час найбольш вопытны народны кантралёр універсітэта — на важнейшым і цяжэйшым участку работы. Яго клопаты — забеспячэнне і быт.

Памочнікі Мікалая Філімонавіча ў сённяшняй праверцы — студэнты-радыёфізікі. А як жа інакш? Хто, як не яны, павінны быць больш за ўсіх зацікаўлены ў паляпшэнні бытавых умоў свайго жыцця? Чацвёртакурснік Мікалай Кабарыха, старшыня камісіі грамадскага кантролю за работай устаноў гандлю і грамадскага харчавання факультэта, прывычны да падобных праверак. Старшыня прафбюро, студэнт III курса Мікалай Майсееў узброены фотаапаратам.

Успамінаю, што, расказваючы пра вынікі амаль кожнай чарговай праверкі на пасяджэннях КНК, Мікалай Філімонавіч заўсёды імкнецца падмацаваць зробленыя вывады доказам. А фотаздымак — аргумент важкі.

Студэнцкай сталовай у радыёфізікаў няма. Яны харчуюцца ў сталовых НДІ ПФП і СКТБ з ВВ. Абедзве яны сустракаюць нас хвастамі абедзеннай чаргі. Але сёння наш кірунак туды, дзе звычайным наведвальнікам «уваход забаронены».

Прыдзірліва аглядае Мікалай Філімонавіч цэхі прыгатавання ежы, халадзільнікі, склады, правярае маркіроўку посуду і няхітрых прыстасаванняў. Яго значны вопыт і кампетэнтнасць дыктуюць заўвагі там, дзе пачынаючым кантралёрам усё здаецца правільным:

— Чаму ў кухонных работніц няма індывідуальных ручнікоў? Дзе гумавыя палавікі? Вось тут парушаецца тэхналогія мыцця посуду...

Згаджаецца з заўвагамі загадчыца вытворчасці Галіна Яўгенаўна Міснік (сталовая НДІ ПФП). Што можа, імкнецца выправіць адразу. А па некаторых пытаннях просіць народны кантроль дапамагчы — звярнуцца ў адпаведную інстанцыю.

Размаўляем з наведвальнікамі сталовых, пraглядаем кнігі скаргаў, цікавімся, як ставяцца кіраўнікі сталовых да заўваг. І зноў здзіўляюся кампетэнтнасці, амаль прафесіяналізму Мікалая Філімонавіча ў падыходзе да свайго грамадскага абавязку. У адказ на маё здзіўленне М. Ф. Кавалёў мOўчкі дастае з папкі невялічкую брашурку — вучэбны дапаможнік Ю. Б. Шафірава для падрыхтоўкі грамадскіх санітарных інструктараў:

— У нашай справе без ведання сваіх правоў і абавязкаў не абысціся. Сам рэгулярна цікаўлюся адпаведнай літаратурай. Ды і іх, — Мікалай Філімонавіч ківае ў бок хлопцаў, — стараюся навучыць.

І вучыць. Ён не толькі чытае лекцыі слухачам школ народных кантралёраў розных факультэтаў, але і праводзіць з імі абавязковыя практычныя заняткі.

...Дзве праверкі ў дзень мабыць і замнога. Але ж усе мы ведаем, што Шчамысліца далёка ад галоўнага корпуса, і калі ўжо прыехалі сюды...

Падрабязна азнаёміўшы загадчыкаў вытворчасці сталовых з выяўленымі недахопамі і падпісаўшы акты праверак, Мікалай Філімонавіч накіроўваецца ў бок восьмага інтэрната.

І тут зноў з першых жа крокаў вопытны кантралёр звяртае нашу ўвагу на тое, што мы нават і не заўважылі: не абазначаны месяц на графіку дзяжурства па інтэрнату членаў студсавета (такі графік можа вісець хоць год — за ім няма канкрэтнай справы). На пажоўклым ад часу «Плане работы студсавета» пераклеены лічбы гадоў.

— Што ж у вас план работы за год не змяніўся? — цікавіцца Мікалай Філімонавіч.

Ды і «Маланка» аб выдатным стане асобных пакояў — без даты.

Мікалай Філімонавіч запісвае нумары лепшых пакояў. Ён зойдзе паглядзець, як жывуць студэнты. Распытае кожнага аб умовах жыцця, выявіць недахопы, запіша скаргі. Заўважыць, што вельмі малыя ў інтэрнаце чытальныя залы і ленінскі пакой, не хапае сантэхнічнага абсталявання на кухнях, не абсталяваны сушылкі. А потым будзе доўгая і канкрэтная размова з камендантам: нешта можна выправіць тут жа, на месцы, нешта абавязкова трэба вынесці на абмеркаванне КНК...

Угледзячыся ў працу народнага кантралёра, пераконваешся, што выяўленне недахопаў для Мікалая Філімонавіча не самамэта. Ён кіруецца жаданнем дапамагчы, выявіць і пераадолець усе бытавыя недарэчнасці, якія часта здаюцца нам нават дробязямі. Мы імкнёмся не заўважаць іх у штодзённым жыцці, прыстасоўваемся да іх, скараемся. Але яны балюча помсцяць нам за абыякавасць. Хто не ўспомніць сапсаванага з-за іх настрою ці марна патрачанага часу?

Каб бытавых непаладак у нашым жыцці было менш, каб кожнаму студэнту універсітэта былі створаны як мага больш спрыяльныя ўмовы для паўнацэннай работы і вучобы, заўсёды на сваім пасту М. Ф. Кавалёў — народны кантралёр.

**Т. САХАШЧЫК.**
**Наш кар.**

● СЛУЖБА, ЗНАЁМАЯ ЎСІМ

# ПЕРААДОЛЬВАЮЧЫ ЦЯЖКАСЦІ

**Напэўна няма ва універсітэце такога чалавека, які б не карыстаўся паслугамі аддзела забеспячэння. Запыты самыя розныя — ручкі, папера, мэбля, прылады і абсталяванне для вучэбных і навуковых мэт...**

**Размова з Уладзімірам Іванавічам ТАРАСЕВІЧАМ, начальнікам аддзела забеспячэння, адбылася на мінулым тыдні.**

— Мы пастаянна імкнёмся дастаць неабходныя матэрыялы, але, паверце, нават самая вялікая прадпрыймальнасць і кемлівасць не дапамогуць, калі вырабаў, якія так патрэбны фізікам ці гісторыкам, няма ні ў пастаўшчыкоў, ні ў арганізацый, гатовых пайсці нам насустрач.

Ведаеце, у мяне ўжо складваецца ўражанне, што як бы мы ні працавалі, усё роўна будуць казаць, што спраўляемся са справай дрэнна. Вядома, недахопы ў рабоце аддзела забяспячэння ёсць, як і ў рабоце іншых падраздзяленняў. Мы даём далёка не той аб'ём матэрыялаў, які ад нас патрабуюць. Але ёсць жа і аб'ектыўныя цяжкасці. Аб гэтым, на жаль, не памятаюць. У нас практычна няма складаў. Калі паступаюць дэфіцытныя матэрыялы, мэбля і іншае, то бывалі выпадкі, калі нам давадзілася аддаваць іх «з калёс».

Хачу сказаць, што штат АМТЗ невялікі, ды і працуюць у асноўным пенсіянеры. (Любы вопытны забеспячэнец пойдзе лепш на прадпрыемства: там і зарплата большая, і прэміі часта выплачваюць). І тым не менш робім шмат. З вялікімі цяжкасцямі, але ўсё ж набываем неабходныя матэрыялы і абсталяванне. І гэта, улічваючы, што дэфіцыт будаўнічых матэрыялаў, мэблі вельмі вялікі. Ды што казаць! Заяўкі на лака-фарбавыя матэрыялы задавальняюцца толькі на 10 працэнтаў. Але ж ніхто ў нас не сядзіць сярод непафарбаваных сцен.

За дзень да нас прыходзяць дзесяткі людзей практычна з кожнага факультэта, і ў кожнага свая просьба, свае патрабаванні. Калі ж мы не заўсёды можам дапамагчы, у наш адрас сыплюцца скаргі і абвінавачанні. Ці заўсёды яны справядлівыя?

Пачну з заявак. Кожны год мы прадстаўляем МінВНУ БССР зводныя даныя таго, што неабходна, складзеныя на аснове заявак факультэтаў і інстытутаў БДУ. Але ў сувязі з аб'ектыўнымі цяжкасцямі — наяўнасцю дэфіцыту — заяўкі гэтыя задавальняюцца прыкладна на 25—30 працэнтаў. Напрыклад, на сантэхніку наогул толькі на 2—5 працэнтаў. Дрэнна абстаяць справы з электратаварамі, радыёпрыборамі, оптыкай, імпартным абсталяваннем.

На 60 працэнтаў заяўкі падраздзяленняў неабгрунтаваны, завышаны і, як правіла, не адпавядаюць тым бюджэтным сродкам, якія адпускаюцца факультэтам і інстытутам на іх набыццё. Акрамя адсутнасці элементарнай арганізаванасці і кантролю з боку адміністрацыі падраздзяленняў, тут сказваецца і псіхалогія перастрахоўшчыка: трэба 10 штук — закажу 100, тады патрэбныя 10 атрымаю напэўна. У выніку к канцу года на рэчы, сапраўды неабходныя, грошай не застаецца. І тады гавораць, што «эканоміць» бухгалтэрыя. На самай жа справе ўсё намнога прасцей: грошы затрачаны на пакупку тых 100 штук, з якіх патрэбна ўсяго 10.

Хацелася б сказаць некалькі слоў і аб беражлівых адносінах да дзяржаўнай маёмасці. Гэта вельмі важна. Вядома, напрыклад, аб складаным становішчы з мэбляй. Яна патрэбна ўсім. Многія хацелі б замяніць сапсаваныя шафы, грузныя пісьмовыя сталы на новыя, сучасныя. І мы імкнёмся па меры сіл садзейнічаць гэтаму законнаму жаданню. Але часта яно ператвараецца ў спажывецкія адносіны да універсітэцкай маёмасці. Паглядзіце, як часам не па-гаспадарску, неашчадна абыходзяцца ў нас з народным дабром. Разлічваюць: выпішам на складзе—забеспячэнцы дастануць. Мы, канешне ж, дастанем. Толькі ў мінулым годзе аддзел забеспячэння набыў мэблі і іншага тэхналагічнага абсталявання на 160 тысяч рублёў. Гэта амаль у два разы больш запланаванага. Пры гэтым штогод выдаткоўваюцца вялікія сумы на рамонт паламанай, разбітай мэблі — тумбачак, сталоў, дзвярэй — дзесяткі, сотні тысяч рублёў. Прычым ва універсітэце адсутнічае цэнтралізаваная майстэрня для рамонту мэблі, што таксама ўскладняе работу.

У заключэнне хацелася б сказаць аб пагрузцы і разгрузцы прымаемых тавараў. Іх вага амаль кожны дзень складае 5—6 тон. Аб дапамозе давозіцца прасіць выпадковых людзей, тых, хто трапіць на вочы. А што рабіць, калі прыбывае цягнік з цэглай ці шклопрафілітам? За нясвоечасовы зварот тары накладваюць штраф. Здавалася б, звярніся за дапамогай у дэканат — і ўсе праблемы будуць вырашаны. Ды дзе там! Пакуль што ёсць толькі жадаючыя крытыкаваць.

Што ж рабіць, каб выправіць становішча?

Перш за ўсё на факультэтах і ў інстытутах трэба назначыць каго-небудзь з матэрыяльна адказных галоўным па кантролю за складаннем абгрунтаваных заявак, якія б улічвалі бюджэтныя сродкі, а не перапісваліся з году ў год пад капірку. Гэтым жа людзям можна даручыць і кантроль за размеркаваннем матэрыялаў. Акрамя таго, наспела, па-мойму, неабходнасць у стварэнні спецыяльнай групы ў аддзеле забеспячэння, якая б займалася абсталяваннем навукова-даследчых работ па гаспадарчых дагаворах.

Гэта толькі неабходныя меры, якія, на наш погляд, трэба было б прыняць для паляпшэння забеспячэння, размеркавання і выкарыстання матэрыялаў і абсталявання. Могуць быць і іншыя прапановы. Калі яны ёсць, прыходзьце ў аддзел забеспячэння. Вас з задавальненнем выслухаюць і пастараюцца ўлічыць пажаданні ў далейшай рабоце. Бо ў выніку ва ўсіх універсітэцкіх падраздзяленняў мэта адна — забяспечыць выпуск высокакваліфікаваных спецыялістаў і высокі ўзровень навуковых даследаванняў.

**Запісала Н. ЖУКАВА.**

● ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

## Шчаслівага шляху, СБА-82!

**ЯШЧЭ НА ПАМЯЦІ** ў многіх успаміны пра мінулае будатрадаўскае лета, а ўжо поўным ходам ідзе падрыхтоўка да новага працоўнага семестра. У гэтым годзе перад камсамольскай арганізацыяй універсітэта стаяць вялікія задачы. Трэба сфарміраваць 89 атрадаў агульнай колькасцю 2743 чалавекі. Атрады будуць працаваць у Мінску і Мінскай вобласці, Віцебскай і Пскоўскай абласцях, Карэльскай АССР, Малдаўскай ССР, Хабараўскім краі і іншых раёнах краіны.

Якасць работы атрадаў летам у многім залежыць ад дакладнай арганізацыі падрыхтоўчага перыяду. На факультэтах заканчваецца падбор і зацвярджэнне кандыдатур камандзіраў і камісараў, поўным ходам ідзе фарміраванне атрадаў.

Трэба адзначыць, што зараз склалася пэўная дыферэнцыяцыя атрадаў. Як правіла, выязныя СБА больш вопытныя, бо іх аснову складаюць байцы, якія ўжо неаднаразова выязджалі на будоўлі, ведаюць гэту справу. Але нягледзячы на такія ўмовы, у гэтыя атрады імкнуцца студэнты малодшых курсаў, якія, напэўна, нават і не задавалі сабе пытання: а што я ведаю пра атрады, што ўмею рабіць і чым буду займацца там? Рамантыка — гэта добра, але за гэтым стаіць сур'ёзная работа. Не трапіўшы ў выязны СБА, рабяты наогул адмаўляюцца ехаць у атрад. Яны не разумеюць, што для тых, хто з самага пачатку паедзе са сваёй групай ці курсам, мясцовыя СБА стануць сапраўднай будатрадаўскай школай, дзе набываюцца навыкі і веды, ствараецца моцны калектыў, а ўжо потым будзе і Карэлія, і БАМ, і Цюмень.

**А. ЧУЛКОЎ,**
начальнік штаба працоўных спраў універсітэта.

# СЁННЯ—ЯКАСЦЬ ВЕДАЎ, ЗАЎТРА—ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦЫ!









**Перад вамі другая група чацвёртага курса юрыдычнага факультэта.**

**НА ЗДЫМКАХ: выдатніца, член камітэта камсамола факультэта Галіна Шылько; заняткі па судзебнай балістыцы вядзе дацэнт А. І. Кастроў; лекцыю па «Асновах судзебнай мовы» чытае загадчык кафедры крымінальнага працэсу прафесар Я. А. Мацвіенка; як і заўсёды, на выдатна адказвае Ірына Кулажанка.**

ТУРЫСЦКІМІ МАРШРУТАМІ

# Вёслы над рэкамі

ЗА АКНОМ ВЯСНА. Для турыстаў-воднікаў да пачатку сезона 1982 года яшчэ доўгія два месяцы. Але як хочацца, каб хутчэй зноў заблішчалі над рэкамі вёслы байдарак і плытоў, каб зноў побач з табой былі сябры, з якімі пройдзены цяжкія і цікавыя маршруты. Гэты доўгачаканы час нібы наблізіўся на вечары-«агеньчыку» турыстаў-воднікаў універсітэта, які адбыўся ў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі.

Да яго доўга рыхтаваліся. Імкнуліся, каб ён стаў цікавым і запомніўся не толькі бывалым турыстам, але і навічкам, якія робяць свае першыя крокі. Былі афармлены стэнды, прысвечаныя паходам 1981 года, падрыхтаваны слайд-праграмы, запрошаны аўтары і выканаўцы турысцкіх і самадзейных песень.

І вось весела зашумела зала. Не сакрэт, што мімалётныя сустрэчы і размовы на вуліцы, на рабоце мала задавальняюць сяброў-турыстаў, якія разам прайшлі нялёгкімі дарогамі. Зараз ім прыемна зноў вярнуцца, хаця б ва ўспамінах, у тыя маляўнічыя куткі нашай Радзімы, у якіх яны пабывалі. Перад вачыма паўставалі і родная Беларусь, і Карпаты, Карэлія, Каўказ, Алтай. Маляўнічыя слайды змяняліся песнямі самадзейных аўтараў.

З цікавасцю было сустрэта выступленне турыстаў-лыжнікаў, якія не толькі паказалі сувязь усіх відаў турызму, але і іх своеасаблівасць.

Асаблівае месца ў праграме вечара занялі ўспаміны пра апошнія падарожжы універсітэцкіх турыстаў на алтайскую раку Катунь. Зняты ў час паходу аматарскі кінафільм паказаў моц і веліч гэтай сібірскай ракі. Гэты паход быў самым складаным у гісторыі воднага турызму БДУ. Кадры фільма прадэманстравалі нямала сур'ёзных і амаль драматычных момантаў барацьбы людзей і свавольнай Катуні. І мы ўбачылі, як стыхія была зломлена смеласцю і майстэрствам турыстаў.

Цікавым развіццём гэтай жа тэмы было выступленне рэдактара Беларускага тэлебачання А. Чуланава, які мінулым летам таксама прайшоў па Катуні, праўда, у складзе іншай групы. У час падарожжа ён зняў два фільмы — «Успаміны пра Катунь» і «Алтайская адысея», першы з якіх быў ужо паказаны па тэлебачанню, а прэм'ера другога адбудзецца ў сакавіку. Вопытны турыст-воднік, ён па-свойму ўбачыў гэты сібірскі край і гэту раку. Там, дзе нашых турыстаў цалкам ахоплівала імклівасць вады, яе моц, ён змог паказаць лірызм і пластычнасць векавой барацьбы чалавека і прыроды. Маляўнічыя і паэтычныя яго замалёўкі аб прыродзе Алтая, яго жыхарах, іх жыцці і працы.

Удачы вечара ў многім садзейнічалі універсітэцкія аўтары і выканаўцы песень. Песні, смех суправаджалі вечар на ўсім яго працягу. І ўсеагульнай была думка — такія вечары трэба зрабіць традыцыйнымі.

**С. ГАРБАЧОЎ,**
**Ф. ЕРМАЛІЦКІ,**
**супрацоўнікі НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі.**

# ВАБЯЦЬ ПРЫГОДЫ

ЕДЗЕМ НА ІРКУТ. Водны паход па рацэ чацвёртай катэгорыі складанасці для нас (шэсць чалавек з плытом і байдаркай) — перш за ўсё Вялікае Падарожжа. Чакалі і прыгод.

З Іркуцка да пасёлка Монды на мяжы з Манголіяй дабіраліся рознымі шляхамі: хто на аўтобусе, хто на спадарожных машынах. Плыт будавалі два дні, сабралі і байдарку.

Міма нашай палаткі шумна пранесліся калегі-масквічы на элегантных байдарках. А ўвечары двое з іх, прыцiхлыя, ішлі па беразе ў зваротным напрамку ў пасёлак за правіянтам. Іх група разбілася на парогах у цясніне кіламетрах у пяці ніжэй па плыні. Прапалі плыўсродкі, патанулі прадукты і частка амуніцыі. Іркут жартаваць не любіць.

...Першы парог прайшлі ўпэўнена: спачатку плыт, байдарка за ім. Кіламетры за чатыры ад старту нас чакала прыгожая і складаная пераշкода: каскад з трох ступеняў з метровымі валамі за кожнай.

Экіпажы працавалі зладжана, хаця байдарка і зачарпнула некалькі вёдраў вады. Адчуванні незабыўныя. Табе ўжо не да вады, якая б'е ў твар, нервы напружаны, працуеш вяслом як апантаны.

Эмоцыі здаюцца рознакаляровымі. Спачатку шэрыя — агляд па берагу. Чаканне выматвае душу. Чым менш глядзіш, тым больш упэўнена пройдзеш. Блакітныя — нарэшце адплылі, унутры лёгка-лёгка. Чырвоныя з чорным — праходзім парог. Работа, работа і работа. Ты ўвесь, як сціснутая спружына. І нарэшце, ў светла-жоўтых фарбах—фініш. Усмешка на твары... Рака за гэта абавязкова прапануе вам нечаканую халодную ванну. Бр-р-р!

Цяжка пісаць пра гэта хораша: незабыўная «архітэктура» адвесных сцен, грукат ракі на парогах, ты наскрозь пратыкаеш вадзяны вал на нябачнай з-за пены байдарцы... Цяпло кастра. Гітара. Няходжаны лес, чорныя горы...

Што яшчэ? Рэшткі разбітай машыны, што недарэчна ржавелі на дне цясніны. Скалалазанне на днёўках. Кабарга з дротам на шыі каля белай бярозы (мы цягнулі яе да кастра, чакаючы стрэлу ў спіну нябачнага нам браканьера). Амаль фантастычны расказ мясцовага хлапчука пра згублены залаты россып у гарах. Усё было...

**К. ЧААДАЕЎ,**
**студэнт II курса геафака,**
**слухач аддзялення ФГП.**

УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ ЛЫЖНІКА

# ПРАЙГРАЎШЫХ НЕ БЫЛО

**З САМАЙ РАНІЦЫ ля лыжнай базы універсітэта, што ў шостым інтэрнаце, было мнагалюдна.**

**— Люда, не забудзь пальчаткі, а то цяжка прыйдзецца на лыжні.**

**— Вазьмі, Саша, вось гэтую мазь. Сёння яна згадзіцца.**

**— Калі ласка, Светачка, дай тваю шапачку прабегчыся.**

**Ішлі апошнія прыгатаванні да выхаду на старт...**

**Забягаючы наперад, скажам, што Усесаюзны дзень лыжніка, ініцыятарам правядзення якога была газета «Советский спорт», паклікаў на лыжню больш за 4160 студэнтаў Белдзяржуніверсітэта. Прыемна, што спаборніцтвы прайшлі арганізавана і ў захапляючай спартыўнай барацьбе. Вясёлыя, бадзёрыя, студэнты паспяхова спраўляліся са сваімі дыстанцыямі. Для мужчын — 5 км, для жанчын — 3 км.**

**З румянцам на шчоках вярталіся лыжнікі на базу. Іх месца на лыжні займалі другія студэнты. Ну, а як пераможцы? Мы іх не называем. У гэты дзень чэмпіёнаў і прайграўшых не было. Пераможцам стаў кожны, хто выйшаў на лыжню.**

**І. ПАПКО.**

СПАРТЫЎНАЕ АРЫЕНТАВАННЕ

# НА ЛЯСНЫХ ТРАСАХ

**У АДНЫМ з маляўнічых лясных куткоў Мінпшчыны, у раёне станцыі «Зялёнае», праводзілася першынство фізічнага факультэта па арыентаванню на маркіраванай трасе.**

**Задача, якую паставілі перад удзельнікамі спаборніцтваў, была не з лёгкіх. Мужчынам трэба было пераадолець 4,5 кіламетра па лыжнай трасе, прайсці 4 кантрольныя пункты з найменшай колькасцю штрафных ачкоў. Лепшы вынік паказаў Анатоль Зінчанка (АН БССР), які выступаў па-за конкурсам. Сярод студэнтаў факультэта пераможцам стаў Барыс Грыцук (II курс). Ён прыйшоў да фінішу без штрафных ачкоў, выйграўшы ў Сяргея Белагалова (I курс) 8 секунд. Трэці вынік паказаў другакурснік Сяргей Аўдзееў.**

**Дзяўчаты выйшлі на дыстанцыю ў 3,4 кіламетра з 3 кантрольнымі пунктамі. Лепшы рэзультат паказала студэнтка біяфака Тамара Волкава, якая таксама выступала па-за конкурсам. Першае месца заняла Ірына Івашка (II курс). Другое — Марына Русак (II курс), трэцяе — Валянціна Караткіна (I курс).**

**І. ЗНАК,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў,**
**студэнт геафака.**

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

# «СТРАЧАНАЯ ПЕРАМОГА»

ПІШУ ад імя той самай жаночай каманды па валейболу факультэта журналістыкі, якая, як адзначыў у сваёй заметцы «Не толькі майстэрства» («Беларускі універсітэт», № 6 ад 18 лютага 1982 года) старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту М. Кучынскі, «прэтэндавала на I месца ў другой групе, але не заняла яго з-за нізкай сваёй дысцыплінаванасці».

Я не хачу сцвярджаць, што пытанне аб дысцыпліне на спаборніцтвах узнята няслушна. Але калі мы ўжо гаворым не толькі пра майстэрства, дык чаму не высвятляем усе прычыны, якія перашкаджалі правядзенню валейбольных сустрэч? Да пытання аб дысцыпліне я хачу дадаць яшчэ адно — аб арганізацыі спаборніцтваў.

Праводзіліся яны, як вядома, у час заліковай сесіі. Згадзіцеся, гэта не вельмі зручна: вечарам ісці на гульню, а заўтра раніцай — на залік.

Так, мы прэтэндавалі на I месца, мы ўпарта ішлі да яго. Узровень гульні каманды значна павысіўся дзякуючы майстэрству прыйшоўшых да нас дзяўчат-першакурсніц. Пытанне аб дысцыпліне для нас проста не існавала. Таму што кожны пасля некалькіх папярэдніх перамог паверыў у перамогу канчатковую. І марыў аб ёй. Запасныя ў нас былі. Але на кожную гульню з 8 чалавек мы выдзялялі 6, якія павінны былі абавязкова прыйсці. Два ж запасныя здавалі залікі або рыхтаваліся да іх.

Сяброўка па камандзе на апошнюю гульню спазнілася зусім выпадкова. Але давайце зараз успомнім і пра тое, што ў той час, які значыўся ў графіку, сустрэчы пачыналіся вельмі рэдка. На перадапошняй з іх, дарэчы, мы чакалі пачатку гульні больш за гадзіну, таму што ў адведзены час гулялі чамусьці каманды юнакоў фізфака і мехмата. 12 чалавек (па 6 з журфака і філфака) сядзелі амаль гадзіну і нерваваліся таму, што амаль у кожнага заўтра быў залік, а страчаны час не вернеш.

Калі ж мы паскардзіліся аднаму з выкладчыкаў кафедры фізвыхавання — ён з усмешкай прапанаваў нам не прыходзіць на спаборніцтвы.

А ці не лепш было арганізаваць іх, напрыклад, хаця б у лістападзе, каб гульні прыносілі іх удзельнікам сапраўднае задавальненне, не псавалі настрой, а ўзнімалі яго.

**Л. МАЛАШЭНЯ,**
**капітан зборнай каманды журфака па валейболу.**





**Чарговае пасяджэнне клуба «Палітыкус». Яго члены — студэнты многіх факультэтаў, а таксама замежныя студэнты з розных краін свету. На парадку дня чарговага пасяджэння — дзейнасць камуністычных партый капіталістычных краін, аб якой расказвае студэнт факультэта журналістыкі Лі Амаду.**

Фота **В. Шачака.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

11 сакавіка 1982 г.

АТ 00137. Зак. 513.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ